# Змест


Прадмова ........ 5
Глава 1 ........ 8
Глава 2 ........ 20
Глава 3 ........ 31
Глава 4 ........ 42
Глава 5 ........ 53
Глава 6 ........ 67
Глава 7 ........ 79
Глава 8 ........ 92
Глава 9 ........ 104
Глава 10 ........ 114
Глава 11 ........ 127
Глава 12 ........ 140
Глава 13 ........ 151
Глава 14 ........ 164
Глава 15 ........ 174
Глава 16 ........ 186
Глава 17 ........ 200
Глава 18 ........ 210
Глава 19 ........ 223
Глава 20 ........ 231
Пасляслоўе ........ 238

# Глава 1

– Хутчэй, хутчэй, хутчэй! – кот бег наперадзе, спрытны і вёрткі, як пакрытая поўсцю маланка, і час ад часу азіраўся на чалавека, які ніяк не мог утрымаць тэмп. На рагу ён прытармазіў і незадаволена зашыпеў:

– Максім, хутчэй! Давай, варушыся!

Хударлявы хлопец сярэдняга росту як мог акуратна прабіраўся праз натоўп за катом. Стаяў цёплы вечар, пачатак лета, і галоўная барная вуліца горада была запоўненая вясёлымі гулякамі. Кудлаты праважаты нырнуў у падваротню старых кварталаў Верхняга горада, Максім таропка абышоў гучную кампанію каля аднаго з бараў і рушыў услед за ім.

Тут было цішэй. Дзесьці гучала музыка, але праз тоўстыя сцены даляталі толькі басы. Бум-бум-бум... Завулак заканчваўся тупіком. Кот зашыпеў і выгнуў спіну, позірк яго быў накіраваны ў запоўненую ценем прастору ў дальнім канцы. Максім азірнуўся, упэўніўся, што ніхто іх не бачыць, запаліў над далонню агеньчык і асцярожна штурхнуў яго ў цемру. Той плаўна паплыў у паветры, пакуль не ўткнуўся ў сцяну.

Пад сцяной нерухома ляжаў чалавек. Максім ціха наблізіўся да яго, пастаяў, прыглядзеўся, а потым апусціўся на калені і развярнуў ляжачага тварам да святла. Чалавек быў жывы, але беспрытомны, яго калаціла дробная дрыготка, вочы закаціліся, вусны паторгваліся. Малады хлопец, мо гадоў дваццаць яму. Калі б заўважыў яго хто іншы, напэўна вырашылі б, што малы хапіў лішку ў бары ці звязаўся з чым горай. Абярэжнік цяжка ўздыхнуў:

– Спазніліся.

– Што? – кот усё яшчэ стаяў каля ўваходу ў завулак.

– Спазніліся, кажу. Падыдзі сюды, ён бяспечны.

Кот бокам, не разгінаючы спіну і гэтак жа высока трымаючы распушаны хвост, падабраўся бліжэй. Прынюхаўся і пракаментаваў:

– Псінай нясе.

Максім кіўнуў:

– Так, ужо ператвараецца. Схаваць бы яго. Калі ён апрытомнее тут, на вуліцы, ды яшчэ і да людзей выйдзе па звычцы, тады хутка апынецца на Гурскага.

Ён паглядзеў на гадзіннік: далёка за поўнач, хутка пачне віднець. Давядзецца, канешне, накінуць морак, каб іх ніхто не заўважыў. Вельмі не хацелася цягнуць на сабе даволі буйнога хлопца, бо Максім ніколі асаблівымі здольнасцямі па падняцці цяжкасцей пахваліцца не мог. Але падобна да таго, што цяпер іншых варыянтаў не засталося.

– Давай яго ў падзямелле да Вія аднясём. Пад Ратушу.

Кот нарэшце расслабіўся і дзелавіта абнюхаў боты незнаёмца.

– Нясі куды хочаш. У яго падэшвы пахнуць лесам.

Максім пацiснуў плячыма:

– Тут каля моста елкі растуць, можа, ён там праходзіў. Будзь сябрам, збегай да Ратушы, папярэдзь. Яны не любяць, калі прыходзяць нечакана. Скажы, я забяру яго пасля заходу.

Кот незадаволена матлянуў хвастом, але спрачацца не стаў, бязгучна выбраўся на вуліцу і знік у напрамку Ратушы.

Максім яшчэ раз агледзеў незнаёмага хлопца. Мяркуючы па ўсім, да канца трансфармацыі заставалася пара гадзін. З глыбокага, ледзь заўважнага, дыханне перамянілася на частае і паверхневае. Тэмпература цела відавочна падымалася, вочы цяпер былі моцна заплюшчаныя, і зрэнкі пад павекамі мітусіліся з боку ў бок, быццам хлопец бачыў сон. Так у нейкім сэнсе і было. Бядак глядзеў чарадзейскі сон пра тое, як ён ператвараецца ў ваўка.

Максім зняў вятроўку, звязаў рукавы ў вузел і прасунуў імправізаваную пятлю пад плячыма хлопца. Махнуў рукой, накідваючы морак, уздыхнуў і пацягнуў цела да Ратушы.

Гэта быў другі выпадак за тыдзень: пазамінулай ноччу яны знайшлі дзяўчыну на вакзале ў такім жа стане – у ранняй стадыі ператварэння ў ваўкалака. Дзіўныя справы. Як і сёння, тым разам яны з катом адчулі ўсплёск незвычайнай магіі, але, пакуль дабраліся, яе след знік. Ні адзін свядомы, разважлівы пярэварацень не будзе пераўтварацца ў цэнтры горада. Яны наогул на дух не выносяць гарады. У Максіма было некалькі знаёмых ваўкалакаў-чарадзеяў, і яны цярпець не маглі «гучныя бетонныя мурашнікі». Ладна, калі б прыгарад, але цэнтр... І што яшчэ больш трывожыла – мяркуючы па працягласці ператварэння, у абодвух выпадках гэта здаралася ўпершыню. То бок: мутнасць свядомасці, адсутнасць кантролю над інстынктамі, праблемы з самаідэнтыфікацыяй. Дасведчаны пярэварацень, які перажыў хаця б некалькі ператварэнняў, лёгка справіўся б з гэтымі пабочнымі эфектамі, але ў першы раз патрабавалася ў сярэднім каля сутак, каб прывесці сябе ў парадак. І як яны ператварыліся? Максім бегла агледзеўся, пакуль выцягваў хлопца з завулка. Побач зноўку не было ні нажоў, ні пнёў, ні асінавых калоў.

Адзінае, што прыходзіла ў галаву, – ператварэнне праз праклён. Але Максім вельмі спадзяваўся, што абыдзецца без гэтага. Таму што варыянт, што нехта ходзіць па яго горадзе і праклінае жыхароў, абярэжніку зусім не падабаўся.

Як бы там ні было, заўчора з нейкага перапуду самым зручным месцам, каб схаваць дзяўчыну, Максім палічыў уласную кватэру. Ужо потым ён лаяў сябе як мог, калі давялося звязаць непрытомную ваўчыцу ўсімі прасцінамі, што былі ў доме, і з заміраннем сэрца чакаць, пакуль яна прачнецца. На шчасце, ваўкалачка хутка сарыентавалася ў сітуацыі. Быццам бы розум яе зусім не змяніўся, толькі знешнасць. Вось што

значыць моцная псіхіка. Так што сёння дома Максіма чакаў агромністы, галодны і жудасна інтэлігентны воўк. Мяркуючы па дакументах, госця была студэнткай гістарычнага факультэта. Шкада, што ваўкалакі не могуць размаўляць. «Цікава, – разважаў Максім, пакуль павольна цягнуў цяжкое цела па брукаванцы, – кім акажацца хлопец? Ці будзе ён гэткім жа адэкватным і міралюбівым? Можа, у іх з дзяўчынай ёсць нешта агульнае?» А яшчэ Максім падумаў пра тое, што па дарозе дадому варта будзе зайсці па сасіскі – трэба ж нечым госцю пакарміць.

Неба на ўсходзе пакрысе святлела, таму абярэжнік не дазволіў сабе спыніцца ні на секунду, пакуль не дацягнуў сваю знаходку да ўзгорка, на якім узвышалася Ратуша. У адной з клумбаў, прыкрытая моракам, зеўрала дзірка. Калі Максім падышоў бліжэй, то змог разгледзець сходы, што вялі ўніз, у прасторны каменны тунэль, па сценах якога мігцелі рубінавыя водблескі. Побач з уваходам у паветры луналі два прывіды, а непадалёк ад іх сядзеў кот і вылізваў хвост.

– Доўга ж ты топкаўся. Вось, чакаюць сабачку нашага, – кот кіўнуў галавой у бок маўклівых прывідаў.

Максім падцягнуў хлопца бліжэй да ямы і дастаў з-пад яго цела вятроўку.

– Залог, – ці то прашыпеў, ці то прашаптаў адзін з прывідаў і працягнуў Максіму невялічкую піялку.

Абярэжнік дастаў з кішэні сцізорык і зрабіў маленькі надрэз на пальцы, потым сцэдзіў кроплю крыві ў піялку. Прывід кіўнуў і панёс піялку ў тунэль. Другі закінуў хлопца сабе на плячо, быццам той не важыў анічога, і моўчкі знік у тунэлі ўслед за першым.

Зямля, як жывая, разам з кветкамі і травой напаўзла на дзірку. Пара секунд – і быццам бы і не было там уваходу ў падзямеллі Вія.

– А сквапны стаў дзядок, праўда? – кот пацягнуўся. – Мог бы і задарма дапамагчы.

# Глава 2

Калі Максім увайшоў у кавярню, над галавой звыкла бразнулі званочкі. Зала была пустая, але побач з касай сабралася невялікая чарга. Цёплы летні вечар, у горадзе ўжо квітнелі ліпы, і паветра позняга чэрвеня было як мёд. Таму жадаючых застацца ў памяшканні не знайшлося, іншая справа – узяць напой з сабой. Максім патаптаўся троху каля ўвахода і, калі ўпэўніўся, што барыста яго заўважыла, прайшоў унутр, каб заняць сваё звычайнае месца каля акна. З задавальненнем выцягнуў ногі, адкінуўся на мяккім фатэлі і ледзь не заснуў.

– Табе, можа, плед прынесці? – з абдымкаў дрымоты яго вырваў да непрыемнасці бадзёры і насмешлівы голас. Максім расплюшчыў вочы і пацягнуўся.

– Прывітанне, Крысціна. Што новага?

– І табе прывітанне. Ды паціху. Да сонцастаяння рыхтуемся, часу ўжо мала.

– А дзе ў гэтым годзе збіраецеся?

Дзяўчына пацiснула плячыма:

– Не ў Мінску, не хвалюйся. Табе клопатаў не дадамо.

Максім кіўнуў.

– І на тым дзякуй. Ты прынесла тое, пра што я пытаў?

– Так. Табе, можа, кавы? Выглядаеш не вельмі.

– Эспрэса-тонік?

Крысціна кіўнула:

– Канешне. Хвілінку.

Пакуль гатавалася кава, Максім ад няма чаго рабіць разглядаў кавярню. Тыповы прытулак гарадскіх ведзьмаў. Пад столлю – мяцёлкі сушаных зёлак. На сценах развешаны сухія галінкі, шышкі, пер’е, кантаваныя шкляныя пацеркі.

У куце – вялізнае павуцінне, прыхаванае мігатлівай гірляндай. Каля адной са сцен – старадаўняя кніжная шафа, запоўненая кнігамі ў пацёртых вокладках. Назвы на пераплётах былі размытыя. На памяці Максіма ніхто з наведвальнікаў ні разу не ўзяў адтуль аніводнай кнігі – вось што значыць добра наведзены заклён адводу вачэй. Крысціна неяк тлумачыла яму, як гэта працуе: звычайны чалавек паглядзіць на шафу, захопіцца антуражнасцю, старасцю і багаццем кніг і... пераключыцца. Займецца сваім дэсертам ці ўткнецца ў экран тэлефона. Можа быць, потым, па дарозе дадому, згадае, што хацеў прагледзець кніжку-другую, але махне рукой – маўляў, наступным разам. Але, натуральна, наступным разам здарыцца тое самае.

Такія тонкія заклёны былі Максіму не пад сілу. Ён наогул мала што разумеў у магіі, хаця пры неабходнасці інстынктыўна чараваў направа і налева. Кінуць морак, скокнуць у Падсвецце, збудаваць на хаду баявы заклён – вось гэта калі ласка. Менеск калісьці тлумачыў яму, што абярэжнік па прыродзе сваёй не маг, а... як жа ён тады сказаў... «ідэальнае ёмішча існасці мага». Па ўсім атрымлівалася, што чаруе быццам бы не ён, а той «абярэжнік», якім ён стаў. Максім з тых часоў абяцаў сабе разабрацца, калі спраў стане паменей, ды ўсё не складвалася.

Дзеля забавы ён выбраў на паліцах пацёрты том барвовага колеру, падняўся і падышоў да шафы. З усіх сіл спрабуючы не страціць канцэнтрацыю, хлопец працягнуў руку да кнігі. Перад вачыма ўсё размылася. Тады ён адышоў на пару крокаў, засяродзіўся, прышчурыўся, зрабіў рэзкі крок да шафы і выхапіў кнігу з паліцы.

У іх з Крысцінай было нешта накшталт гульні. Кожны раз прыходзячы ў кавярню, Максім спрабаваў абысці заклён і хаця б прачытаць назву на любым з пераплётаў. А Крысціна і яе сяброўка Мая ціха пасмейваліся за стойкай,назіраючы за яго спробамі.

Адчуваючы радасць ад маленькай перамогі, ён паглядзеў на вокладку кнігі, што ляжала ў яго руках.

«Malleus Maleficarum».

Крысціна ўжо ішла да яго століка з падносам.

– Можна павіншаваць, Сім? Нарэшце да цябе дайшло! – яна паблажліва ўсміхнулася і паставіла на стол каву і талерку з нейкай здобай. – Вячэраеш за кошт установы, раз ты такі маладзец. Не прайшло і года, як ты здагадаўся прымружыцца!

Максім акуратна паставіў кнігу назад у шафу, мімаходам адзначыўшы, што для гэтага не давялося хітрыць, кніга стала на паліцу як самая звычайная, незачараваная. Потым ён вярнуўся за столік.

– Крысціна, чаму ў вас на паліцы стаіць «Молат Ведзьмаў»?

Дзяўчына пацiснула плячыма:

– А чаму б яму там не стаяць? Кніжка як кніжка. Троху больш дурацкая і бессэнсоўная, чым астатнія.

– Так, але… Ну, інквізіцыя, усё такое. Жудаснае чытво ж.

Крысціна махнула рукой:

– Хутчэй зануднае. Напэўна, яна тут больш ад спачування – каму яна зараз патрэбная. Даведнікі па зёлках нашмат больш карысныя, але шафа вялікая, месца хопіць усім.

– Але ж нехта яе набыў?

– Набыў? – Крысціна прысела за стол. – Ты што, Сім. Мы не набываем гэтыя кнігі. Яны самі з'яўляюцца, калі нам патрэбныя. Ну, ці калі яшчэ хто-небудзь іх прыцягвае.

Да Максіма пакрысе пачало даходзіць:

– Таму і надпісы размытыя, так? Таму што ніхто не ведае, што там за кніга, пакуль не возьме яе з паліцы?

Крысціна задуменна кіўнула:

– Я думаю, шафа падсоўвае тую кнігу, у якой ты на дадзены момант адчуваеш найбольшую патрэбу. Дарэчы, вель-

мі цікава: пра што ты думаў, калі даставаў з паліцы «Молат Ведзьмаў»?

Максім закашляўся, адпіў кавы і змяніў тэму. Размаўляць з ведзьмамі было ўсё адно як прагульвацца па тонкім лёдзе.

– Ты прынесла абрус?

– Так, побач з крэслам. – Максім заўважыў каля ножкі крэсла чорны поліэтыленавы пакунак. Адтуль тырчаў кончык шараватага даматканага абруса. – Пастарайся не запэцкаць, яго яшчэ прабабця ткала. Яна ў вясковым касцёле дапамагала і абрусы свае на імшу насіла, вось некалькі засталося. Велікодны і з-пад каляднай батлейкі. Ты ж велікодны прасіў?

Максім кіўнуў. Крысціна абаперлася локцямі аб стол і нахілілася бліжэй да яго:

– А навошта табе, калі не сакрэт? Не прыгадаю, каб раней абярэжнік рытуаламі займаўся.

Вочы яе ажно заблішчэлі ад цікаўнасці. «Ведзьмы – чыста як коткі», – ужо які раз падумаў Максім. Памахай перад носам банцікам цікавай гісторыі – і яна адразу робіцца ўся такая ўважлівая.

З іншага боку, ведзьмы – тыя яшчэ балбатушкі.

– Крысціна, а што ты ведаеш пра Воўчы Хвост?

Ведзьма расчаравана адкінулася на спінку крэсла:

– Гэта той, што Батанічны сад?

– Ага, ён самы.

– Ну, там пару стагоддзяў таму быў парк са сваім звярынцам. Калі людзям стала не да яго, ваўкоў напладзілася ў вялізнай колькасці. А ўскраек горада ўсё ж, праз некаторы час ваўкі сталі скаціну грызці, пару разоў на людзей нападалі. І тады сялянам дазволілі на іх паляваць. Тушы забітых ваўкоў у адно месца сцягвалі і хвасты на шубы і каўнеры адразалі. Тыя хвасты, што не падыходзілі, там і пакідалі. Таму і празвалі той кавалак лесу Воўчым Хвастом. Ну, вось, здаецца, і ўсё, што я ведаю. А навошта табе?